# Да 75-годдзя вызвалення Беларусі

# Поўнае вызваленне Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў у адлюстраванні сучасных гістарыяграфічных наратываў

*С. Я. Новікаў*

**У артыкуле ўпершыню праводзіцца аналіз гісторыі поўнага вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нацысцкіх захопнікаў у адлюстраванні сучаснай нацыянальнай гістарыяграфіі Беларусі, Расіі, Польшчы і Германіі. Асвятляюцца крыніцазнаўчыя аспекты баявых дзеянняў Чырвонай арміі і вермахта. Раскрываецца сутнасць процілеглых метадалагічных падыходаў у дачыненні да ходу, вынікаў і ацэнак баявых падзей у час правядзення аперацый па поўным вызваленні Беларусі ў 1943—1944 гадах. Паказваецца важнасць навуковага даследавання праблемы ў сучаснай беларускай гістарыяграфіі на аснове метаду кампаратыўнага аналізу сучасных гістарыяграфічных наратываў.**

**The history of the liberation of Belarus from Nazi occupation resulting from current historical research on this topic in Belarus, Germany, Poland and Russia is analyzed in the article for the first time in historical literature. The historical sources devoted to the different aspects of the military actions of the Red Army and German Army are considered. The article is devoted to the essence of the different methodological approaches concerning the development, the results and evaluations of the military actions during the development of the military operations devoted to the liberation of Belarus in 1943—1944. The author shows the importance of historical research of the problem in modern Belarusian historiography based on the method of comparative analysis of the modern historiographical narratives.**

**Ключавыя словы:** поўнае вызваленне Беларусі, Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя «Баграціён», нацысцкія (германскія) захопнікі, беларуская гістарыяграфія, расійская гістарыяграфія, польская гістарыяграфія, германская гістарыяграфія, гістарыяграфічны наратыў.

**Keywords:** complete liberation of Belarus, Belarusian strategical operation Bagration, Nazi invaders, Belarusian historiography, Russian historiography, Polish historiography, German historiography, historiographical narratives.

*У аснове прапанаванага аналізу ляжаць гістарыяграфічныя факты з найноўшых беларускіх і расійскіх, а таксама замежных (польскіх і нямецкіх) навуковых прац, выхад якіх у апошні час сведчыць не толькі аб пачатку фарміравання новых гістарычных ведаў, але і аб станаўленні адпаведных даследчыцкіх наратываў, прысвечаных баявым дзеянням часцей Чырвонай арміі і вермахта ў Беларусі ў ходзе забеспячэння поўнага вызвалення беларускай тэрыторыі ад нацысцкіх захопнікаў і правядзення Стаўкай Вярхоўнага Галоўнакамандавання Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён». З улікам таго, што гісторыкі гэтых дзвюх умоўных груп выкарыстоўваюць розную дакументальную базу і кіруюцца процілеглымі метадалагічнымі падыходамі, што прыводзіць да кантрасных ацэнак адных і тых жа падзей гісторыі вызвалення Беларусі з пачатку восені 1943 года да канца лета 1944-га, аўтар звяртаецца да метаду кампаратыўнага аналізу айчыннага і замежнага гістарыяграфічных наратываў.*

**Беларусь.** Выходным момантам для разгляду баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні тэрыторыі Беларусі ў 1943—1944 гадах з'яўляецца навуковы наратыў, закладзены яшчэ ў энцыклапедыі савецкага часу «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941—1945» [1]. У выданні адсутнічае вычарпальная інфармацыя пра няўдалыя спробы Заходняга фронту вызваліць паўночна-ўсходнія раёны Беларусі восенню 1943 — у пачатку 1944 года, паколькі акцэнт у энцыклапедыі зроблены толькі на Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» [1, с. 71—74]. З аналізу адзначанага наратыву савецкага перыяду вынікае, што тагачасны чытач быў пазбаўлены магчымасці скласці поўную карціну гісторыі баявых дзеянняў на тэрыторыі Беларусі ў канцы 1943 — пачатку 1944 года [1; 2].

Толькі ў апошнія гады гісторыкі суверэннай Беларусі зрабілі важныя крокі для таго, каб на новым тэарэтычным узроўні і фактalagічнай базе расставіць адпаведныя навуковыя акцэнты ў даследаванні баявых дзеянняў Чырвонай арміі па вызваленні Беларусі ў 1943—1944 гадах [3—5]. Так, у дачыненні да падзей лета 1944 года беларускія вучоныя выкарыстоўваюць наступную тэрміналогію: «Беларуская наступальная аперацыя 1944 года “Баграціён”», «Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя», «Аперацыя “Баграціён”», «Беларуская стратэгічная наступальная аперацыя». Змешчаны канкрэтныя назвы ўсіх 11 малавядомых наступальных аперацый, якія былі праведзены Заходнім фронтам на віцебскім (3), багушэўскім (2) і аршанскім (6) напрамках у канцы 1943 — пачатку 1944 года.

У той жа час гэтыя падзеі звязаны канцэптуальна. У найноўшых выданнях беларускіх гісторыкаў выкарыстоўваюцца тэзісы савецкай гістарыяграфіі пра тое, што «основные действия на белорусском направлении вынуждали противника держать тут мощную группировку, не дав тем самым перебросить части своих войск на юг» [3, с. 432]; «...советские войска держали в постоянном напряжении противостоящие 3-ю танковую и 4-ю армии вермахта, сковывали их войска и нанесли им значительный урон» [5, с. 414]. Заўважым, што гэтыя тэзісы адразу ж выклікаюць пытанні ва ўважлівага чытача па той прычыне, што паводле дырэктыў Стаўкі Вярхоўнага Галоўнакамандавання, аддадзеных 12, 18 лістапада і 23 снежня 1943 года, а таксама 18 студзеня 1944 года, камандуючым войскамі 1-га Прыбалтыйскага і Заходняга франтоў ставілася адзіная задача: «О разгроме витебской группировки противника» [6, с. 57; 7, с. 58; 8, с. 58; 9, с. 59]. Паводле зместу згаданых дырэктыў, размова ідзе выключна аб поўным разгроме праціўніка (!), а не аб тым, каб у ходзе наступлення стрымаць, спыніць ці скаваць яго прасоўванне на ўсход. Чаму беларускія



*Сяргей Яўгеньевіч Новікаў,*
*кандыдат гістарычных навук, загадчык кафедры гісторыі, сусветнай культуры і турызму Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта*

і расійскія гісторыкі не даюць тут рэальнага тлумачэння гістарычных фактаў і вядомых дакументаў? Чаму не працягваецца практыка, уведзеная яшчэ ў пачатку 1990-х гадоў расійскім даследчыкам М. А. Гарэевым у дачыненні да разгляду тых падзей?

На гэтым фоне варта адзначыць, што сучасныя беларускія гісторыкі — аўтары спецыяльнага выдання «Освобождение Беларуси. 1943—1944» [4], якое выйшла да 60-годдзя вызвалення беларускай зямлі ад германскіх захопнікаў, імкнуцца рэканструяваць гістарычную карціну баявых дзеянняў і выявіць фактычныя прычыны няўдач, раскрыць рэальныя маштабы страт, пралікаў і вынікаў тых 11 безвыніковых наступальных аперацый, адлюстраваных у малавядомым у савецкі час дакладзе камісіі Дзяржаўнага камітэта абароны ад 11 красавіка 1944 года.

Да гэтага часу ў беларускай гістарыяграфіі не праведзена спецыяльнага даследавання, у аснове якога ляжалі б новыя айчынныя і замежныя дакументы, напрацоўкі замежнай гістарыяграфіі па адлюстраванні гісторыі баявых дзеянняў як Чырвонай арміі, так і вермахта ў Беларусі ў канцы 1943 — пачатку 1944 года. Сёння назапашаны значны эмпірычны матэрыял, які пакуль застаецца без комплекснага аналізу беларускіх гісторыкаў.

**Расія.** Кажучы пра расійскую гістарыяграфію, прысвечаную гісторыі вызвалення Беларусі ў 1943—1944 гадах, спынімся на трох фундаментальных выданнях. Першае — 4-томная праца «Великая Отечественная война. 1941—1945» канца 1990-х гадоў. Яе трэцяя кніга прысвечана заключнаму перыяду Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку аналізу прычын няўдач наступальных аперацый Заходняга фронту ў Беларусі восенню 1943 — зімой 1944 года [10]. Прадстаўляючы аперацыю «Баграціён», расійскія даследчыкі адзначаюць, што яна па праве можа лічыцца адной з самых бліскучых аперацый не толькі Вялікай Айчыннай, але і Другой сусветнай вайны. «Операция "Багратион" явилась первой стратегической наступательной операцией Красной Армии, проведённой в период, когда в Западной Европе начали военные действия вооружённые силы США и Англии» [10, с. 76].

Аналіз другога матэрыялу, які ўвайшоў у чацвёрты том «Освобождение территории СССР. 1944 год» новага 12-томнага фундаментальнага выдання «Великая Отечественная война 1941—1945 годов» [11], дае магчымасць убачыць асноўныя ацэнкі і вынікі баявых дзеянняў ва ўсходняй Беларусі і пры яе вызваленні ў ходзе Беларускай наступальнай аперацыі, ці «аперацыі "Баграціён"» [11, с. 347]. Аўтары паўтараюць тэзіс савецкага часу пра тое, што няўдалыя дзеянні Заходняга фронту на цэнтральным участку савецка-германскага фронту «сковали группу армий "Центр", не позволив ей оказать помощь терпевшим катастрофическое поражение группам армий "Юг" и "А"» [11, с. 117]. Падобны тэзіс быў уведзены яшчэ ў 12-томніку савецкага часу «История Второй мировой войны. 1939—1945». Так, у 8-м томе пры разглядзе «военных (бая-

вых. — *С. Н.*) действий на западном направлении» сцвярджалася, што «активными действиями в течение всей зимы и первых весенних месяцев 1-й Прибалтийский, Западный и 1-й Белорусский фронты сковывали основные силы мощной по своему составу группы армий "Центр", не позволяя немецко-фашистскому командованию за счёт её сил оказывать помощь группам армий "Юг", "А" и "Север", терпевшим в то время тяжелейшие поражения» [12, с. 137].

Агульнай прыкметай згаданых беларускіх і расійскіх выданняў з'яўляецца тое, што добра вядомыя сёння ваенныя дакументы нямецкага боку не ўлічваюцца пры аналізе гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і вермахта на тэрыторыі Беларусі. У гэтых працах вучоныя практычна не выкарыстоўваюць спецыяльныя нямецкія даследаванні, абыходзяць маўчаннем найноўшыя замежныя распрацоўкі, прысвечаныя гэтай тэме. Да таго ж айчынныя гісторыкі не ўвялі ў навуковы зварот трафейныя нямецкія дакументы, якія захоўваюцца ў фондах Расійскага дзяржаўнага ваеннага архіва (РДВА) у Маскве і Цэнтральнага архіва Міністэрства абароны Расійскай Федэрацыі (ЦАМА РФ) у Падольску.

Як вынік, у выдадзеных у Беларусі і Расіі фундаментальных працах у тэкстах нагрувашчаны вялікі масіў эмпірычных матэрыялаў, датычных паказу ваенных падзей, але не з розных, а толькі з аднаго пункту гледжання — савецкага. Пры гэтым часта атрымліваецца, што Чырвоная армія вяла наступленні на невядомага ці «безыменнага» праціўніка: без прывядзення канкрэтных звестак пра агульны колькасны і штатны састаў палявых і паветраных часцей вермахта, без вызначэння дакладнай лакалізацыі войск праціўніка на мясцовасці, без раскрыцця структуры яго баявых падраздзяленняў, маштабаў выкарыстання тэхнікі і ўзбраенняў. Такім чынам не параўноўваюцца страты абодвух бакоў, агульная колькасць зніклых без вестак, палонных і г. д. Гэта значыць, загады аб правядзенні наступальных аперацый на пачатковым этапе вызвалення Беларусі, асабліва ўвосень 1943-га і ў пачатку зімы 1944 года, аддаваліся без фактычнай ацэнкі сіл праціўніка.

**Польшча.** Паўнавартаснае навуковае даследаванне тэмы вызвалення Беларусі ў сучаснай польскай гістарыяграфіі нам пакуль невядома. Тым не менш праца польскага даследчыка Р. Урублеўскага «Бабруйскі "кацёл" 1944 года» [13] па сваёй значнасці не саступае нават некаторым афіцыйным выданням айчыннай гістарыяграфіі. Аўтар гэтай працы раскрывае асаблівасці баявых падзей на адным з ключавых пунктаў нямецкай абароны, пераўтворанай у раёне Бабруйска ў непрыступную крэпасць. Па агульнай колькасці Бабруйская нямецкая групоўка налічвала дзесяць дывізій, у тым ліку вядомую аўстрыйскую 45-ю пяхотную дывізію, якая ў 1941 годзе штурмавала Брэсцкую крэпасць, а таксама 20-ю танкавую дывізію, якая разам з іншымі падраздзяленнямі ўключала больш за 250 танкаў, штурмавых гармат і знішчальнікаў танкаў. Бабруйская аперацыя, як паказвае польскі даследчык, стала адной з ключавых падзей аперацыі «Баграціён» летам 1944 года. Без адначасовага абвалу нямецкай абароны ў раёне Бабруйска і Віцебска наступальны кідок да Мінска з акружэннем нямецкай 4-й палявой арміі і агульным крушэннем усяго фронту групы армій «Цэнтр» быў бы немагчымы.

У гэтым плане хацелася б звярнуць увагу на выказванне вядомага расійскага да-

”
Агульнай прыкметай згаданых беларускіх і расійскіх выданняў з'яўляецца тое, што добра вядомыя сёння ваенныя дакументы нямецкага боку не ўлічваюцца пры аналізе гісторыі баявых дзеянняў Чырвонай арміі і вермахта на тэрыторыі Беларусі. У гэтых працах вучоныя практычна не выкарыстоўваюць спецыяльныя нямецкія даследаванні, абыходзяць маўчаннем найноўшыя замежныя распрацоўкі, прысвечаныя гэтай тэме.

следчыка, бліскучага знаўцы баявых дзеянняў як Чырвонай арміі, так і вермахта на Усходнім фронце, у тым ліку гісторыі Беларускай стратэгічнай наступальнай аперацыі 1944 года, — А. В. Ісаева. Пішучы кароткую прадмову да рускага выдання кнігі Р. Урублеўскага, расійскі ваенны гісторык заключае: «Ситуация по изучению войны качественно изменилась сравнительно недавно, в конце 1980-х и начале 1990-х годов. Тем не менее, с момента этого качественного перелома прошло уже около четверти века. Поэтому сегодня, когда от событий войны нас отделяет уже более семи десятилетий, писать её историю по старинке, перефразируя известное высказывание, это даже не ошибка, это преступление. Хорошим тоном и даже строго обязательным для исследователей войны является привлечение документальных данных обеих сторон» [13, с. 9].

Менавіта гэтым правілам кіруецца польскі даследчык. Урублеўскі шмат гадоў займаецца вывучэннем баявых дзеянняў на савецка-германскім фронце пераважна на завяршальным этапе вайны. Яго гістарычнае даследаванне аб баявых дзеяннях вермахта і Чырвонай арміі ў раёне Бабруйска грунтуецца на аналізе дакументаў абодвух бакоў, нямецкіх і савецкіх. Заўважым, што ў аснову яго даследавання пакладзены дакументы Ліквідацыйнага штаба вермахта, створанага для збору інфармацыі аб цалкам знішчаных злучэннях, якія падлягалі расфарміраванню. Гэтыя архіўныя матэрыялы (баявыя зводкі і рапарты, складзеныя ацалелымі афіцэрамі, а таксама паказанні салдат, якія вырваліся з акружэння пад Бабруйскам) упершыню ўведзены ў навуковы зварот і пралiваюць святло на шматлікія дэталі Бабруйскага «катла» і краху групы армій «Цэнтр», што стала страшнай катастрофай вермахта ў Беларусі.

**Германія.** У Германіі яшчэ ў другой палове нулявых гадоў была падрыхтавана больш чым 1000-старонкавая праца аб гістарычных падзеях на Усходнім фронце ў 1943—1944 гадах [14], у тым ліку аб баявых дзеяннях вермахта на тэрыторыі Беларусі. Нямецкі даследчык К.-Г. Фрызер, які працаваў з масівам самых розных дакументаў, у тым ліку з РДВА і ЦАМА РФ, даволі падрабязна раскрывае характар гістарычных падзей на Усходнім фронце ў 1943—1944 гадах, асабліва на момант разгрому групы армій «Цэнтр». Кажучы пра баявыя дзеянні летам 1944 года, вучоны адзначае, што яны ствараюць асобную главу, якая наўрад ці была ў ранейшай ваеннай гісторыі, асабліва з улікам іх драматызму і маштабаў страт. У той жа час нямецкі аўтар лічыць, што для савецкіх гісторыкаў баявыя дзеянні Чырвонай арміі ў 1943 годзе даволі доўгі час знаходзіліся пад забаронай, таму набылі характар «забытай вайны» [14, S. 277]. У даследаванні канстатуецца факт, што германскія войскі групы армій «Цэнтр» летам 1943 года былі ўжо не ў стане стрымліваць націск Чырвонай арміі, паколькі на той час кожнай з чатырох германскіх армій, што знаходзіліся на беларускай тэрыторыі, супрацьстаяў цэлы фронт ці спецыяльная армейская групоўка. Акрамя таго, у тыле германскіх войск дзейнічала больш за 100 тысяч савецкіх партызан. На думку Фрызера, тэарэтычна ў распараджэнні камандавання для абароны амаль 700-кіламетровага рубяжа на ўсходзе знаходзіліся 42 пяхотныя, чатыры палявыя і паветраныя, дзве танкавыя грэнадзёрскія і шэсць танкавых дывізій. Фактычна на справе неабходна казаць пра значна меншыя сілы [14, S. 302].

У аснову даследавання Р. Урублеўскага пакладзены дакументы Ліквідацыйнага штаба вермахта, створанага для збору інфармацыі аб цалкам знішчаных злучэннях, якія падлягалі расфарміраванню. Гэтыя архіўныя матэрыялы ўпершыню ўведзены ў навуковы зварот і пралiваюць святло на шматлікія дэталі Бабруйскага «катла» і краху групы армій «Цэнтр», што стала страшнай катастрофай вермахта ў Беларусі.

Дзённікі баявых дзеянняў розных злучэнняў групы армій «Цэнтр», выкарыстаныя аўтарам для аналізу баявых дзеянняў на паўночным участку Цэнтральнага фронту восенню 1943 года, даюць уяўленне пра сапраўдныя маштабы кровапраліцця, якое адбылося на беларускай тэрыторыі на лініі абароны 3-й германскай танкавай арміі. Паводле загаду Гітлера, гэтая армія павінна была трымаць «крэпасць Віцебск», так званыя вароты да Прыбалтыкі. У ходзе зімніх баёў, якія скончыліся ў сярэдзіне студзеня 1944 года, абодва бакі панеслі значныя страты. Пры гэтым з нямецкага боку агульныя страты складалі 19 150 забітых, параненых і прапаўшых без вестак, а з савецкага, паводле афіцыйных звестак, шэсць наступаючых савецкіх армій страцілі 135 012 чалавек і больш за 1200 танкаў [14, S. 317].

Галоўным аб'ектам на цэнтральным участку з'яўлялася шаша Масква — Мінск, уздоўж якой вялі наступленне сем савецкіх армій. Ім супрацьстаяла толькі адна 4-я германскай армія, у складзе якой па стане на 1 лістапада 1943 года было 193 510 чалавек, пры гэтым ніводнай танкавай дывізіі. За паўгода на гэтым напрамку войскі савецкага Заходняга фронту (дзейнічаў да 24 красавіка 1944 года) правялі восем наступальных аперацый: пяць — на паўночным флангу паблізу Оршы, дзве — на паўднёвым, і толькі адна вялікая наступальная аперацыя была ажыццёўлена ўздоўж самой шашы. З дакументаў вынікае, што ніводная з 11 наступальных аперацый, праведзеных Чырвонай арміяй супраць германскіх 4-й палявой і часткова 3-й танкавай армій, не была паспяховай. Як паказвае нямецкі гісторык, савецкія войскі страцілі 530 537 чалавек параненымі і забітымі, страты ж нямецкага боку з 12 кастрычніка 1943 года да канца сакавіка 1944-га склалі 10 566 забітых і прапаўшых без вестак і 24 490 параненых [14, S. 324].

Кажучы пра крах групы армій «Цэнтр» летам 1944 года, Фрызер аналізуе вынікі баявых падзей у ходзе паспяхова праведзенай наступальнай аперацыі «Баграціён», якія і прывялі да катастрофы групы армій «Цэнтр». Паводле дакументальных крыніц, наступаючым савецкім войскам супрацьстаялі сілы 2, 4 і 9-й палявых і 3-й танкавай армій агульнай колькасцю 486 493 салдаты, а таксама 3236 гармат, 118 танкаў і 452 САУ (самаходныя артылерыйскія ўстаноўкі), 602 самалёты [14, S. 532]. Нямецкі гісторык адзначае, што з пачаткам першай фазы аперацыі «Баграціён» савецкая армія пераважала нямецкую ў жывой сіле ў 3,7 раза, артылерыі — 9,4 раза, танках — 23 разы, самаходных устаноўках — 3,6 раза і самалётах — 10,5 раза. Да таго ж групе армій «Цэнтр» давялося весці вайну фактычна на два фронты: у якасці «другога фронту» выступалі амаль 150 тысяч партызан, якія дзейнічалі ў тыле нямецкіх армій [14, S. 534].

Заўважым, што нямецкія сілы супрацьстаялі савецкім войскам агульнай колькасцю ў 1,2 млн чалавек: «В общей сложности на белорусском направлении действовали 63 дивизии. В них насчитывалось 1,2 млн человек, 900 танков и штурмовых орудий, 9500 полевых орудий и миномётов. С воздуха советские войска поддерживала авиация 6-го и частично 1-го и 4-го воздушных флотов в количестве 1350 боевых самолётов» [10, с. 55]. У дачыненні да канчатковых страт, панесеных з савецкага боку ў ходзе аперацыі «Баграціён», нямецкі ваенны гісторык прыводзіць наступныя даныя: былі панесены страты, якія складалі 770 888 чалавек (з якіх 180 040 — забітыя і прапаўшыя без вестак, 590 848 — параненыя). Апрача таго, савецкі бок страціў 2957 танкаў і САУ, 2447 адзінак артылерыі і 822 самалёты [14, S. 593].

Катастрофу групы армій «Цэнтр» наглядна характарызуюць статыстычныя даныя адносна страт абодвух бакоў падчас правядзення летняй аперацыі ў Беларусі. Паводле нямецкіх звестак, агульныя страты з нямецкага боку склалі 399 102 чалавекі, у тым ліку: 26 397 — забітыя, 262 929 — прапаўшыя без вестак і 109 776 — параненыя. Гэта пераўзыходзіць маштабы ня-

мецкай катастрофы ў бітве пад Вердэнам у 1916 годзе, калі рэйхсвер страціў 330 тысяч чалавек (разам з параненымі), і значна перавышае страты 6-й германскай арміі пад Сталінградам (60 тысяч забітымі і 110 тысяч палоннымі) [14, S. 594]. Як заключае Фрызер, аперацыя «Баграціён» застаецца самай бліскучай аперацыяй, праведзенай Чырвонай арміяй на працягу ўсёй Вялікай Айчыннай вайны [14, S. 600].

*Падсумоўваючы вышэйсказанае, адзначым: па-першае, крытычны аналіз найноўшых фундаментальных прац, падрыхтаваных у апошнія гады вядучымі беларускімі і расійскімі, польскімі і нямецкімі даследчыкамі, пераканаўча сведчыць аб фарміраванні розных наратываў у нацыянальных гістарыяграфіях. Па-другое, расійскім і нямецкім гісторыкам удалося запоўніць навуковы прабел у даследаванні згаданай праблематыкі і падрыхтаваць спецыяльныя працы ў яе рамках. У беларускай гістарычнай навуцы на сённяшні дзень адсутнічае спецыяльная навуковая работа, напісаная на аснове метаду кампаратыўнага аналізу, у якой гэтая важная тэма вывучалася б на новым метадалагічным узроўні з улікам уведзеных у апошнія гады дакументальных крыніц. Па-трэцяе, замежныя гістарыяграфіі ўзбагаціліся адным з актуальных кірункаў даследавання і практычнай распрацоўкі пытанняў заключнага перыяду гісторыі Другой сусветнай вайны і Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі.*

## Спіс цытаваных крыніц


1. Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны, 1941—1945 : энцыклапедыя / рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. — Мінск : БелСЭ, 1990. — 680 с.
2. Великая Отечественная война 1941—1945 : энциклопедия / гл. ред. М. М. Козлов ; редкол. : Ю. Я. Барабаш, П. А. Жилин (зам. глав. ред.), В. И. Канатов (отв. секретарь) [и др.]. — М. : Сов. энциклопедия, 1985. — 832 с.
3. Беларусь в годы Великой Отечественной войны. 1941—1945 / А. А. Коваленя (рук. авторского коллектива), А. М. Литвин, В. И. Кузьменко [и др.]. — Минск : БЕЛТА, 2005. — 544 с.
4. Освобождение Беларуси. 1943—1944 / В. В. Абатуров (рук. авторского коллектива) ; редкол. : И. И. Басик, А. А. Коваленя [и др.]. — Минск : Беларуская навука, 2014. — 943 с.
5. Страна в огне : в 3 т. / отв. ред. : А. М. Литвин, М. Ю. Мягков ; ред.-сост. Д. В. Суржик. — М. : Абрис, 2018. — Т. 3 : Освобождение. 1944—1945 : в 2 кн. — Кн. 1 : Очерки. — 717 с.
6. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30243 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 12 ноября 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941—1945 : документы и материалы. — М. : Ретроспектива, 2015. — Т. VIII : Освобождение Белоруссии. — С. 57.
7. Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30247 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 18 ноября 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941—1945 : документы и материалы. — М. : Ретроспектива, 2015. — Т. VIII : Освобождение Белоруссии. — С. 58.

**8.** Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 30268 командующему войсками 1-го Прибалтийского фронта, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 23 декабря 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941—1945 : документы и материалы. — М. : Ретроспектива, 2015. — Т. VIII : Освобождение Белоруссии. — С. 58.

**9.** Директива Ставки Верховного Главнокомандования № 220011 командующим войсками 1-го Прибалтийского и Западного фронтов, представителю Ставки на разгром витебской группировки противника от 18 января 1943 г. // Великая Отечественная война. 1941—1945 : документы и материалы. — М. : Ретроспектива, 2015. — Т. VIII : Освобождение Белоруссии. — С. 59.

**10.** Великая Отечественная война. 1941—1945 : военно-исторические очерки. — М. : Наука, 1999. — Кн. 3 : Освобождение. — 510 с.

**11.** Великая Отечественная война 1941—1945 годов : в 12 т. — М. : Кучково поле, 2012. — Т. 4 : Освобождение территории СССР. 1944 год. — 864 с.

**12.** Великая Отечественная война. 1941—1945 : документы и материалы. — М. : Ретроспектива, 2015. — Т. VIII : Освобождение Белоруссии. — 416 с.

**13.** *Исаев, А. В.* Предисловие / А. В. Исаев // *Врублевский, Р.* Бобруйский «котёл» 1944 года / Р. Врублевский. — М. : Яуза-каталог, 2016. — 320 с.

**14.** Das Deutsche Reich und der Zweite Weltkrieg. In 10 B-de. Bd. 8 : Die Ostfront 1943/44. Der Krieg im Osten und an den Nebenfronten / Hrsg. von Karl-Heinz Frieser. — München : Deutsche Verlags-Anstalt, 2007. — 1319 S.

## Даты

*Пімен Панчанка*

Што даты? Гэта толькі вехі
Гісторыі.
А для салдат,
Чые навек закрыты вейкі,
Няма ўжо дат, ніякіх дат.

За рысай той — маўкліва, пуста,
І на дарогах крыжавых
Узводзім помнікі і бюсты
Мы не для іх, а для жывых.

І для дзяцей, каб не зблудзілі
У гушчары нікчэмных дат.
Каб памяць песні нарадзіла
Аб неўміручасці салдат.